# ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ САВЕЦКАЙ ВЫШЭЙШАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Буцько М. А. г. Мінск, БДТУ, дацэнт
Андарала Г. Ф. г. Мінск, БДПУ, дацэнт

Гісторыя савецкай вышэйшай педагагічнай школы – гэта гісторыя яе бесперапыннага развіцця, якая мае свае асаблівасці, свае спецыфічныя рысы. Адной з такіх адметных рыс лінейнай дынамікі сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі СССР з’яўляецца яе кумулятыўны характар, што дазваляе звесці ўсю разнастайнасць з’яў, якія адбываліся ў сферы вышэйшай педагагічнай школы на працягу больш чым сямідзесяці гадоў, да шэрагу пераемна між сабой звязаных, паслядоўных перыядаў, калі кожны наступны з’яўляўся не простым механічным дадаткам новага да старога, папярэдняга, а генетычным яго прадаўжэннем.

Аналіз навуковай і гісторыка-педагагічнай літаратуры, дысертацыйных прац савецкага перыяду сведчыць аб тым, што праблема перыядызацыі вышэйшай педагагічнай школы СССР нязменна знаходзіла сваё адлюстраванне ў рамках даследавання праблем педагагічнай адукацыі. Не паглыбляючыся ў аналіз прапанаваных перыядызацый, толькі адзначым, што ў іх аснову аўтарамі, як правіла, пакладзены партыйна-ўрадавы прынцып перыядызацыі савецкага грамадства і дзяржавы.

Мы падзяляем пункт погляду вучоных-гісторыкаў, якія даследавалі стан падрыхтоўкі педагагічных кадраў на пэўных этапах развіцця савецкай дзяржавы ў адносінах таго, што рэфармаванне савецкай вышэйшай педагагічнай школы залежала ад многіх передумоў палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага характару. Аднак, на наш погляд, галоўнай непасрэднай перадумовай дынамікі вышэйшай педагагічнай адукацыі СССР з’яўлялася накіраванасць школьных рэформ, якія праводзіліся ў краіне. На працягу ўсёй сваёй гісторыі савецкая вышэйшая педагагічная школа знаходзілася ў лагічнай адпаведнасці з развіццём сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі, на якую, у сваю чаргу, непасрэдны ўплыў аказвала эканамічная сітуацыя ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

краіне, фінансавыя магчымасці дзяржавы, паслядоўнасць яе адукацыйнай палітыкі. Рэфармацыйныя працэсы ў сферы агульнай адукацыі краіны нязменна прыводзілі да істотных пераўтварэнняў і змен у сістэме падрыхтоўкі педагагічных кадраў (структура, арганізацыйныя формы, змест, методыка). З гэтага вынікае, што перыядызацыя гісторыі савецкай вышэйшай адукацыі будзе ізаморфнай асноўным перыядам развіцця савецкай агульнаадукацыйнай школы.

Як сведчыць гісторыя савецкай школьнай адукацыі, асноўнымі паваротнымі вехамі ў яе паступальным развіцці з'яўляліся адпаведныя партыйна-ўрадавыя пастановы. Асноўваючыся на тым, што мадэрнізацыя савецкай сістэмы падрыхтоўкі педагагічных кадраў з'яўлялася следствам рэформ сістэмы школьнай адукацыі, мы лічым правамерным выдзеліць чатыры асноўныя перыяды ў развіцці сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі:

- першы перыяд (1917–1929 гг.) – перыяд зараджэння і станаўлення;
- другі перыяд (1930–1941 – 1945–1957 гг.) – перыяд інтэнсіўнага развіцця;
- трэці перыяд (1958–1983 гг.) – перыяд устойлівага развіцця;
- чацвёрты перыяд (1984–пачатак 90-х гг.) – перыяд крызіснага развіцця.

Першы перыяд (1917–1929 гг.) – перыяд зараджэння і станаўлення савецкай вышэйшай педагагічнай школы характарызуецца пошукава-арганізацыйнай накіраванасцю, якая была абумоўлена неабходнасцю абаснавання і развіцця ідэі аб якасна новай педагагічнай адукацыі, адпавядаючай савецкай агульнаадукацыйнай школе.

Ужо ў першыя месяцы пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі савецкі ўрад прыняў некалькі рашэнняў і дэкрэтаў [4, с. 132–133; с. 146], якія прадугледжвалі забеспячэнне ўсеагульнай адукацыі падрастаючага пакалення краіны. Рэалізацыя гэтай складанай задачы была ўскладзена на новую адзіную працоўную політэхнічную агульнаадукацыйную школу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Імклівы рост сеткі не толькі пачатковых, але і сярэдніх школ і, як следства, такі ж хуткі рост патрэбы ў педагагічных кадрах паслужылі перадумовай да правядзення рэарганізацыі дарэвалюцыйных настаўніцкіх інстытутаў у вышэйшыя педагагічныя навучальныя ўстановы і стварэння шэрагу новых педагагічных інстытутаў.

Рэтраспектыўны аналіз працэсу зараджэння і станаўлення савецкай сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі ў перыяд з 1917 па 1929 гг. дазваляе выявіць яе высокую дынамічнасць і супярэчнасць, што праявіліся як у паступальным росце колькасці вышэйшых педагагічных навучальных устаноў, так і пастаянных зменах іх назваў, структурнай арганізацыі, зместу адукацыі. Гэта ў значнай ступені з’явілася вынікам педагагічнага пошуку аптымальнага варыянта вышэйшай педагагічнай навучальнай установы.

Другі перыяд (1930-1941 – 1944-1957 гг.) – перыяд інтэнсіўнага развіцця савецкай сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі характарызуецца масавым адкрыццём педагагічных інстытутаў ва ўсіх саюзных рэспубліках.

Прыняцце 25 ліпеня 1930 года ЦК УКП (б) і 14 жніўня 1930 года ЦВК і СНК СССР пастановы “Аб усеагульным абавязковым пачатковым навучанні” [4, с. 109–111; с. 111–113] з’явілася перадумовай інтэнсіўнага пашырэння сеткі сярэдніх агульнаадукацыйных школ, што, у сваю чаргу, паставіла пытанне аб масавай падрыхтоўцы настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй. Гэта акалічнасць і абумовіла неабходнасць інтэнсіўнага развіцця вышэйшай педагагічнай школы краіны. Урадам саюзных рэспублік было даручана “... тэрмінова разгарнуць сетку педагагічных інстытутаў, ... павялічыць колькасць навучэнцаў у іх” [4, с. 113].

Як следства, ужо ў 1931–1932 гг. педагагічныя факультэты ўніверсітэтаў саюзных рэспублік былі выдзелены ў самастойныя педагагічныя інстытуты. Так, 28 ліпеня 1931 года згодна з пастановай СНК БССР, педфак БДУ быў выдзелены ў самастойны «Беларускі дзяржаўны вышэйшы педагагічны інстытут» [1, с.19].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паралельна ў саюзных рэспубліках пачынаюць працаваць новыя вышэйшыя педагагічныя навучальныя ўстановы. На тэрыторыі Беларусі аднаўляюць дзейнасць Віцебскі, Магілёўскі, ствараецца Гомельскі педагагічныя інстытуты.

Праведзеныя ў 30-я гады мерапрыемствы па развіцці ў краіне вышэйшай педагагічнай адукацыі далі падставу Усерасійскай нарадзе рэктараў універсітэтаў і дырэктараў педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў, якая праходзіла 10-17 сакавіка 1941 года, зрабіць заключэнне, “што педагагічныя інстытуты сфарміраваліся як пэўны тып вышэйшых навучальных устаноў, якія рыхтуюць кваліфікаваных настаўнікаў для сярэдняй агульнаадукацыйнай школы [2, с. 49].

Вялікая Айчынная вайна прыпыніла паступальнае развіццё вышэйшай педагагічнай адукацыі краіны. Яна нанесла сістэме не толькі велізарныя матэрыяльныя, але і кадравыя страты. У прыватнасці, колькасць студэнтаў у педагагічных інстытутах краіны ў параўнанні з даваенным часам скарацілася ўдвая [5, с. 430].

Аднаўленне дзейнасці педагагічных інстытутаў на вызваленых тэрыторыях пачалося задоўга да заканчэння вайны. Так, у 1944 годзе зноў пачалі функцыянаваць педагагічныя інстытуты ў Украіне, Малдавіі, Беларусі (Мінскі, Віцебскі, Магілёўскі, Гомельскі і Гродненскі педагагічныя інстытуты) [6, л. 363].

У выніку ўзнаўленчых мерапрыемстваў ужо ў 1946 годзе сетка педагагічных інстытутаў краіны не толькі дасягнула даваеннага ўзроўню, але і пераўзышла яго. У 120 педагагічных інстытутах краіны навучалася 79 тыс. студэнтаў [3, с. 197]. У далейшым працэс дынамічнага развіцця сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі працягваўся як у колькасных, так і якасных адносінах. Геаграфія размяшчэння педагагічных інстытутаў была прыведзена ў адпаведнасць з патрэбамі канкрэтных саюзных рэспублік. Прыкладам можа служыць Беларусь, дзе ў 1957 годзе педагагічныя інстытуты функцыянавалі ў кожным абласным цэнтры рэспублікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гістарычны адрэзак часу з 1930 па 1957 гады, нягледзячы на негатыўны адбітак ваенных 1941–1945 гадоў, у цэлым з’яўляецца перыядам інтэнсіўнага развіцця савецкай сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі. Колькасныя і якасныя змены істотна ўмацавалі патэнцыял педагагічных інстытутаў як вучэбных і навуковых устаноў, забяспечылі іх вядучую ролю ў сістэме падрыхтоўкі педагагічных кадраў.

Трэці перыяд (1958–1983 гг.) – перыяд устойлівага развіцця характарызуецца далейшым умацаваннем сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі як у краіне ў цэлым, так і ва ўсіх саюзных рэспубліках.

Пачатак гэтаму перыяду паклалі пераўтварэнні ў сістэме народнай адукацыі краіны, абумоўленыя прыняццем у 1958 годзе Закона “Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў СССР [4, с. 53–61].

Рашэнне пастаўленых задач не магло быць рэалізавана без правядзення неадкладных пераўтваральных мерапрыемстваў у сістэме вышэйшай педагагічнай адукацыі краіны.

Як следства, ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР ў 1961 годзе прынялі пастанову “Аб мерах па забеспячэнні агульнаадукацыйных школ настаўніцкімі кадрамі” [4, с. 438–439], якая па сутнасці ўяўляла сабой праграму далейшага развіцця сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі.

Выконваючы пастанову, саюзныя рэспублікі пайшлі па шляху стварэння ў педагагічных інстытутах завочных і вячэрніх аддзяленняў, новых факультэтаў і павелічэння планаў прыёму студэнтаў на ўсе формы навучання.

Сістэмная работа саюзнага і рэспубліканскіх міністэрстваў асветы дазволіла забяспечыць паступальнае развіццё вышэйшай педагагічнай адукацыі. У 1970/71 навучальным годзе падрыхтоўку педагагічных кадраў у краіне ажыццяўлялі 204 педагагічныя інстытуты, у якіх навучалася 832,7 тыс. студэнтаў [5, с. 142].

Чацвёрты перыяд (1984– пачатак 90-х гг.) – перыяд крызіснага развіцця сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Перадумовай пераўтварэнняў у сферы вышэйшай педагагічнай адукацыі ў пачатку гэтага перыяду з’явілася школьная рэформа, якая пачалася ў адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР “Аб далейшым удасканаленні агульнай сярэдняй адукацыі моладзі і паляпшэння ўмоў работы агульнаадукацыйнай школы” і пастановай Вярхоўнага Савета СССР “Аб асноўных накірунках рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы”, прынятых 12 красавіка 1984 года [7].

Важнае месца ў рэалізацыі мерапрыемстваў па рэфармаванні школьнай адукацыі адводзілася сістэме вышэйшай педагагічнай асветы. Аднак, як паказала практыка, яна аказалася не гатовай да таго, каб акумуляваць і педагагічна трансфармаваць змест, формы і метады падрыхтоўкі студэнтаў з улікам новых патрабаванняў, якія прад’яўляла рэформа да настаўніка.

Як следства, савецкая сістэма вышэйшай педагагічнай адукацыі ўступіла ў перыяд свайго крызіснага развіцця. Гэты перыяд быў самым непрацяглым. Тым не менш, ён меў сваю спецыфіку і асаблівасці, якія негатыўна адбіліся на развіцці вышэйшай педагагічнай школы краіны.

Літаратура

1. Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка: гісторыя і сучаснасць (1922-2002 гг.) / Л. Н. Ціханаў [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2002. – 349 с.

2. Итоги Всероссийского совещания ректоров университетов и директоров педагогических и учительских институтов //Советская педагогика. – 1941. – № 5. – С. 47–49.

3. Медынский, Е. Н. Народное образование в СССР / Е. Н. Медынский. – М.: Изд-во АПН РСФСР, 1952. – 257 с.

4. Народное образование в СССР: Общеобразовательная школа: сб. док. 1917–1973 гг. – М.: Педагогика, 1974. – 560 с.

5. Народное образование в СССР / И. А. Каиров [и др.] – М.: Изд-во АПН РСФСР, 1957. – 782 с.

5. Народное образование и культура в СССР: стат. сб. – М.: Финансы и статистика, 1989. – 330 с.

6. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 42. Оп. 5. Д. 381. Л. 363.

7. О реформе общеобразовательной и профессиональной школы: сб. док. и материалов. – М.: Политиздат, 1984. – 111 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ